Наталля Заяц

# “СОНЦА – ПА РУПНАСЦІ – БРАТ МОЙ...” САЛЯРНАЯ ВОБРАЗНАСЦЬ У ЛІРЫЦЫ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

Сонца, адзін з найбольш семантычна аб’ёмных вобразаў-сімвалаў, знайшоў шырокае ўвасабленне ў нацыянальнай паэзіі. Салярны культ, зафіксаваны яшчэ старажытным Баянам у “Слове пра паход Ігаравы”, застаецца актуальным ва ўсе наступныя перыяды літаратурнага развіцця. Побач з непазбежнымі агульнымі значэннямі вобраз сонца ў творчасці кожнага аўтара мае адметнае функцыянальна-сэнсавае напаўненне. Так, у паэзіі Янкі Купалы ён сімвалізуе адраджэнне, у маладнякоўскай лірыцы перадае аптымістычнае захапленне паслярэвалюцыйнай рэчаіснасцю, у давераснёўскай спадчыне Максіма Танка сярод іншых выяўляе патрыятычна-вызваленчыя настроі...

Арыгінальныя мастацкія інтэпрэтацыі салярнага вобраза прастаўлены ў набытку сучаснага майстра слова Васіля Зуёнка. У 1960-я гг. крытык і літаратуразнаўца І. Шпакоўскі трапна назваў тады яшчэ аўтара-пачаткоўца ці не самым паслядоўным культавіком сонца сярод беларускіх пісьменнікаў [3, с. 3]. Уся наступная творчаць В. Зуёнка толькі пацвярджае гэта назіранне – салярная вобразнасць займае вядучыя пазіцыі ў яго паэтычным сусвеце, у залежнасці ад ідэйна-мастацкіх задач напаўняецца інварыянтнымі сэнсамі.

Выдадзены ў 1966 г. першы зборнік В. Зуёнка “Крэсіва” пазначаны выразна анімістычным светаўспрыняццем, што абумоўлівае зварот да сонечнай метафорыкі. Лірычны герой, носьбіт гістарычнай памяці народа, “выкрасае” малюнкі даўняга мінулага, прымярае на сябе светаразуменне продкаў:

*Мачулішча...*
*Відаць, і пры Ярыле*
*Ільны ў нас сеялі,*
*Вымочвалі ў Мачыле.*
*Бель-кужаль пралі, ткалі, вышывалі,*
*Кашулі ў кайстры*
*Напамінкам клалі* [1, с. 28].
(“Успамін”)

Згодна са спрадвечнымі вераваннямі, выключная роля ў жыцці прыроды і чалавека належыць нябеснаму свяцілу, а таксама яго зямному аналагу – агню. Праз выкарыстанне сакральных для язычніцкай, а затым і хрысціянскай свядомасці вобразаў сонца і агню ў лірыцы В. Зуёнка раскрываецца магістральны матыў еднасці з прыродай, выказваецца разуменне сябе яе часцінкай. Пазней анімістычныя погляды, узбагаціўшыся прыродазнаўчымі, рэлігійнымі і філасофскімі ідэямі, трансфармуюцца ў адметны зуёнкаўскі метад даследавання рэчаіснасці і спосаб паэтычнага мыслення – першасна-пачуццёвы касмаганізм. Ён будзе выяўляцца ў жаданні спасцігнуць сутнасць прыроды, сусвету і чалавека, у аднолькавай увазе да

галактычных праблем і незаўважных на першы погляд, будзённых праяў жыцця.

Паэт здольны ўбачыць цудоўнае ў звычайным, здзіўляцца самому і здзіўляць іншых – пейзажная лірыка В. Зуёнка поўніцца нечаканымі метафарамі, яркімі пластычна-зрокавымі вобразамі, у якіх па-новаму пераствараецца наваколле. У прыродаапісальных вершах вобраз сонца часта выконвае фона- і настроестваральную функцыю, "высвечваючы" паэтычную карціну яркімі фарбамі, задаючы адпаведны, жыццясцвярджальны, пафас: "*Яшчэ зіма пад кліч вятроў-гарністаў / Ладкуе снегавую маскіроўку, / А сонца ўжо свайму тэлеграфісту – / Праменьчыку – перадае шыфроўку*" [2, с. 73]. В. Зуёнак надзяляе сонца то рысамі гарэзы, што з задавальненнем удзельнічае ў разняволеных гульнях прыроды ("*горы спелых навальніц*" "*агністымі хвастамі хвошчуць сонца наўздагон*", "*сонца б'е ў агністыя літаўры*", "*сонцам атачонае прырэчча плавае ў сп'янеласці малін*"), то паказвае ў ролі засяроджанага працаўніка ("*Ціха ў асеннім лесе / Сонца лістоту жнее*" [1, с. 100], "*…сонца промнем, бы ніткай вашчонай, <…> / Сшывае два полагі – белы і чорны*" [2, с. 48]). Усепаглынальнай стыхіяй бачыцца паэту восеньскі лістапад – *санцапад*:

*Санцапад*
*у лесе,*
*Санцапад*
*у небе.*
*Санцапад у свеце,*
*Каб галінцы кволай*
*Не забыць аб леце*
*Да вясны вясёлай* [2, с. 163].
("Дол святлее шызы...")

У натурфіласофскай лірыцы, дзе на першы план выходзіць роздумны пачатак, сонца можа выступаць другасным элементам пейзажу, аб'ектам уздзеяння іншых: "*Замкнуўшы сонца, сквапны аканом – / Асенні дзень – / блукае адубела*" [2, с. 84] ("Дрыготкая бярозка пад акном..."); "*...сонца ўскінуўшы за плечы, <...> / Пайшоў – не адгукнуўся вечар*" [2, с. 76] ("Змярканне"). У прыватнасці, яно "падпарадкоўваецца" вобразам, суадносным з катэгорыяй часу, – *асенні дзень, вечар, змярканне.* Падобным творам уласціва элегічная інтанацыя, прыдатная для артыкуляцыі філасофскіх разважанняў пра непазбежнасць асенніх халадоў і зімняга сну прыроды, пра хуткаплыннасць жыцця.

У мастацкай светабудове В. Зуёнка з самага пачатку вызначальнымі, аднолькава каштоўнымі і неабходнымі паўстаюць супрацьлеглыя арыенціры – зямны і нябесны, што ўвасабляюцца ў вобразах двух "агнёў", матыве ўзаемапрыцягнення дзвюх стыхій ("*Ствараю неба – сонечны паганец. / А дайце неба – я ствару зямлю*" [2, с. 144]). Дуалістычнасць мастакоўскіх памкненняў ілюструюць шматлікія вершы, а таксама ліра-эпас і проза: паказальныя загалоўкі маюць паэмная трылогія "Агонь і сонца" (1973–1983) і яе частка "Прыцягненне", кніга празаічных тэкстаў "Паміж небам і зямлёй"

(2009). Ідэя паяднанасці зямлі і неба, напэўна, упершыню прагучала ў вершы "Ралля – аснова...". У творы канцэптуальнае значэнне мае метафара жыцця, якая рэалізуецца праз шэраг нацыянальна-значчных архетыпаў: *сяўба, зярняты, жніво, хлеб.* З'яўленне хлеба – вынік руплівай супрацы чалавека, зямлі і сонца, у якой апошняе выконвае ролю пасрэдніка-сувязнога і рухавіка жыцця:

*Яднае сонца сілу незямную*
*З зямною сілаю –*
*і тчэцца,*
*Тчэцца вечная тканіна:*
*Зямля – аснова,*
*Сонца ўток кідае*
*Праменны...*
*Наліваюцца зярняты...*
*І з песняй жніўнай –*
*спелым караваем –*
*Прыходзіць хлеб у хаты* [2, с. 21].

Семантыка вобраза хлеба таксама амбівалентная: матэрыяльная (ён забяспечвае фізічнае існаванне, становіцца пачатковай ступенню ў іерархіі чалавечых запатрабаванняў) і духоўная (вакол "спелага каравая" яднаюцца людзі, дзеляцца радасцямі, падтрымліваюць адзін аднаго ў бядзе). "*Ён ад зямлі, / а з ім усё – / гасціны, / Заручыны, / вяселлі, / парадзіны, / І геній, што ў стагоддзях уваскрэсне, / І думкі лад у пошуку бяссонным, / І слёзы – / ад зямлі, / і гнеў, / і песня, / І вогненны палёт / насустрач сонцу...*" [2, с. 21–22]. Сонца, такім чынам, з'яўляецца таксама сімвалам духоўных пошукаў чалавека, "вогненных палётаў" да мары.

У многіх лірычных тэкстах, асабліва ранняга перыяду, сонца выступае галоўным каштоўнасным ідэалам (вершы "Ралля – аснова...", "Мільёны год...", "Паміж сэрцам маім і трывогай...", "Я са шляхоў далёкіх і цяжкіх" і інш.). Няспынны рух чалавецтва да самаўдасканалення абумоўлены сонечнай марай: "*Мільёны год, / мільёны год / Да сонца / З цемені ірвуся. / Мільёны год, / мільёны год / Іду. / Іду – / І не спынюся*" [2, с. 12]. Лірычны герой спалучае ў сабе адначасова мінулае, сучаснасць і будучыню; падобна сонцу ў вершы "Ралля – аснова..." паўстае своеасаблівым медыятарам паміж узвышаным і прыземленым, былым і будучым, учора і заўтра ("*Бо ўсіх пачаткаў / я / – працяг / І ўсіх працягаў / я / – пачатак*" [2, с. 12]).

Вобраз сонца выкарыстоўваецца і для раскрыцця супярэчлівай і неадназначнай асобы лірычнага героя, як у вершы інтымнай лірыкі "Залатая лінія дажджу...". "Сонечны і хмарны ў адначассе" малады чалавек спрабуе пракласці мост паразумення з каханай, знайсці апору ў трывожна-шчаслівых адносінах: "*Дзе ж яна, вясёлка, што самкне / Студзень мой з тваім гарачым маем?.. / Ці святой сярэдзіны шукаць? / Ці, як чорным сонцам, галавою / Узмахнуць чарнявай – і гукаць / Ласку тваю – рэха баравое?..*" [2, с. 81]. Аналогія з нябесным свяцілам (чарнявая галава – чорнае сонца) выкарыстоўваецца нават у партрэце лірычнага героя, што ўтрымлівае

пазнавальныя рысы знешнасці самога аўтара. Семантычнае поле вобраза сонца ўзбагачаецца за кошт метафары прыцягнення, у якой сканцэнтравана ідэя вечнага і непазбыўнага кахання: "*Ля цябе, як ля сонца, / Я па крузе іду*" [2, с. 179]. Каханая ўспрымаецца лірычным героем як цэнтр сусвету, падобна сонцу, структуруе жыццё, падпарадкоўвае рух яго "планеты". Такім чынам ключавы зуёнкаўскі матыў прыцягнення з галактычнай сферы пераводзіцца ў асабіста-інтымную, набываючы ўніверсальны сэнс (вершы "Два шляхі, два імгненні...", "У гэты міг...").

З вобразам сонца звязваецца ў В. Зуёнка надзея на лепшае. Яго лірычны герой не пакідае спадзявацца нават у тупіковых сітуацыях: "*Прарастаю трывогамі, / Як зямля каранямі, / Як імкненне – дарогамі, / Як цемень – агнямі. / Узараны ўспамінамі, / Узыходжу чаканнем, / Як вечнасць, бясконцым, / Як травінка праз камень: / Без сонца – да сонца*" [2, с. 121–122]. У працытаваных радках верша "Прарастаю ўспамінамі..." паэт, разважаючы на тэму так званай духоўнай экалогіі, абумоўленай паступовым адміраннем "сялянскай Атлантыды", актуалізуе традыцыйныя для прыродна-вясковага свету вобразы жаўранка і травы, якая ў любых умовах праб'ецца да сонца.

В. Зуёнак апелюе да салярнай вобразнасці і разважаючы аб прызначэнні чалавека, аб місіі мастака і мастацтва: "*Я прыйду, / я прыйду да вас, людзі. / Хай трывога мне сонцам будзе!*" [2, с. 66] ("Паміж сэрцам маім і трывогай..."); "*...Вось так і ў мяне – / турбот аж кішыць / Сонца – па рупнасці – брат мой*" [2, с. 48] ("Люблю цікаваць..."). Пры дапамозе кідкіх сонечных метафар, па-маладому ўпэўненых і смелых тырад агучваецца думка аб неабыякавасці паэта, яго ўстрывожанасці, занепакоенасці лёсам іншых, гатоўнасці прыйсці на дапамогу, што з'яўляецца перадумовай мастацкай творчасці: "*Хто збалелы – надзеяй сагрэю, / Хто зняверыўся – узвалаку / Аж да сонца! – па звонкіх рэях, / Хто заблудзіўся – падам руку*" [2, с. 56] ("Ля падвалін не вухкаў цяжка...").

Пастаянная ўстрывожанасць В. Зуёнка-паэта ў многім абумоўлена яго нялёгкім, абпаленым вайной маленствам. Адным з галоўных у творчасці мастака слова выступае матыў няскончанай – пакуль жыве памяць – вайны, які рэалізуецца ў многіх творах. Так, згадка пра трывожнае дзяцінства ў вершы "Сэрца" паступова трансфармуецца ў роздум-перасцярогу ад магчымага паўтарэння страшнай трагедыі. Адпаведная атмасфера ствараецца сродкамі пейзажу, дзе вобраз сонца атрымлівае нечаканую інтэрпрэтацыю. Чуйнае паэтава сэрца ў снах лунае ў прасторы і часе, пераносячыся з берагоў вогненнага дзяцінства ў толькі знешне спакойную сучаснасць: "*Там яно* (сэрца. – Н.З.) *– дзе люляе вецер / Чараду дажджавых аблачын. / Там яно – дзе ў атамнай гронцы / Дрэмле суха ваяцкі запал, / Там – / каб зноў бессардэчнае сонца / Не ўзвіхурыла вогненны вал...*" [2, с. 105]. Любімы вобраз мае адмоўную канатацыю, чым падкрэсліваецца жахлівая абсурднасць ваеннага свету, яго варожасць у адносінах да чалавека. У вершы "Размова з буслам" сонца можа разглядацца як сімвал вечнага неспакою, што праз гады не пакідае дзяцей вайны:

*Гаспадар бярозы расахатай,*

*Адкажы – табе з вышынь відаць, –*
*Колькі яшчэ будуць аўтаматы*
*Над дзяцінствам нашым клекатаць?*
*Колькі сноў яшчэ вайна атруціць,*
*Колькі душы будзе дратаваць?*
*І дакуль трызнення чорны труцень*
*Будзе сонца наша выпіваць?* [2, с. 79]

Апакаліптычны малюнак падкрэслівае глыбіню перажытай драмы, завастрае аўтарскую інтэнцыю: жаданне засцерачы нашчадкаў ад новай вайны (“каб зямлю не збіла зноў навала”).

В. Зуёнак не абыходзіць увагай салярную вобразнасць і ў творах патрыятычна-адраджэнскай праблематыкі. Так, напрыклад, у вершы “Зарука” разгортваецца рэтраспекцыя жыцця бязмоўнага “нашчадка балта і руса”, што быў “бяздомкам” у сваім доме, пакуль не займеў пракракаў – Купалу, Коласа, Багдановіча. Іх адвечнае беларускае слова “сонцам душу абагрэла”, абудзіла народ ад здранцвення, стаўшы зарукай будучыні. Роля слова, у прыватнасці Купалавага, бачыцца В. Зуёнку адным з галоўных падмуркаў, на якім трымаецца беларускасць і якім забяспечваецца жыццяздольнасць нацыі:

*Аб адным, Божа мой,*
*Малю –*
*Дай апору ў сусветнай гонцы:*
*Беларускаму плугу –*
*Зямлю*
*І Купалавай хаце –*
*Сонца!..* [1, с. 97–98]
(“Аб адным, Божа мой...”)

Напісаны на мяжы стагоддзяў верш-маленне гранічна дакладна выяўляе каштоўнасныя арыенціры прызнанага майстра, беспамылкова абраныя ім у самым пачатку літаратурнага ўзыходжання. Яны палягаюць у дзвюх плоскасцях: зямной, звязанай з першаасновамі быцця, і нябеснай, духоўнай, пазначанай імкненнем чалавека да мары, да ўласнага Сонца. Мастацкая творчасць В. Зуёнка дае магчымасць ажыццявіць гэтую мару – не толькі самому паэту, але і чытачу.

## Спіс літаратуры


1. **Зуёнак, В.** Выбраныя творы / В. Зуёнак ; уклад., камент. аўтара ; прадм. Н. Заяц. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 512 с.
2. **Зуёнак, В.** Жніўны дзень : выбранае / В. Зуёнак ; прадм. Р. Барадуліна. – Мінск : Маст. літ. – 351 с.
3. **Шпакоўскі, І.** Кніга яшчэ ў дарозе / І. Шпакоўскі // ЛіМ. – 1968. – 24 верас. – С. 3.